*Deutsche Version weiter unten im Text*

# Прамова першай старшыні RAZAM Юліі Салаўёвай перад Брандэнбургскай брамай (07.11.2023)

Паважаныя беларусы і беларускі,

берлінцы і берлінкі,

нямецкія сябры і сяброўкі,

паважаная Святлана Ціханоўская і яе каманда,

паважаныя калегі і калежанкі з Народный Амбасады і з Ліберека,

Вялікі дзякуй, што вы сення з намі на Брандэнбургскай плошчы, на мітінгу у падтрымку вольнай Беларусі, краіны, да якой з Берліну можна даляцець меньш чым за 2 гадзіны. Так блізка, але ж так далека. Шмат для каго з Беларусі, і тых, хто даўно жыве у Берліне і тых, хто быў вымушаны пераехаць у апошнія гады, гэтыя дзве гадзіны – розніца паміж вольным жыццем і міліцэйскім гвалтам крымінальнага рэжыму Лукашенкі. Праз гэтыя дзве гадзіны любы, хто калісьці у Нямеччыне падтрымаў дэмакратычны рух Беларусі, можа апынуцца за кратамі і правесці там ад 2 гадзін да шмат гадоў...

Дзве гадзіны падарожжа да нашых бацькоў, да нашых сяброў і сябровак, да нашых любімых месцаў, дзе мы нарадзіліся ці выраслі, дзе нас чакае нашая маладосць ці дзяцінства, гэтыя гадзіны зараз дліной у цэлае жыцце, бо звар’яцелы дыктатар чапляецца за уладу цаной крові і людскога лесу. І таму нажаль, вам, дарагія берлінцы і

берлінкі праз дзве гадзіны падарожжа пакуль што не пабачыць Беларусі з шматлікімі культурнымі мерапрыемствамі, гарацкім жыццем мала чым адрозніваючымся ад жыцця любога еўрапейскага гораду. Пакуль што...

Беларусь сення – гэта нажаль краіна унутранай эміграцыі, дзе пануе страх перад рэпрэсіямі рэжыму, страх страціць працу, страх апынуцца у міліцейскім аўтазаку... Больш за 1.500 палітвязняў, арышты кожны тыдзень на мяжы і у краіне, выявы катаванняў і забароненых відаў абыходжання падчас расследавання палітычна матываваных крымінальных спраў, а таксама забароненых відаў абыходжання з затрыманымі ў адміністрацыйным працэсе, не гаворачы ужо пра палітвязняў.

Але ж дзе вы усе ж можаце пабачыць ту самую крэатыўную, жывую, хоць і вельмі стомленую Беларусь, якая ня гледзячы ні на што працягвае працаваць над Беларусю будучыні, гэта за мяжой у выгнанні. Больш за паўмільену беларусаў і беларусак вымушаны былі з’ехаць у эміграцыю з лета 2020 года, шмат недзяржаўных арганізацый, прадпрымальнікі, журналісты і журналісткі, культурныя дзеячы, акадэмічная эліта, студэнты і студэнткі, урачы, палітыкі, праваабаронцы, прафсаюзнікі і удзельнікі стачачных камітэтаў, усіх і не пералічыць... некалі тысяч даехалі і да Нямеччыны, з іх каля 400 па спецыяльнай праграме палітычнага прытулку.

І сення як старшыня згуртавання беларусаў і беларусак Нямеччыны Разам, перш за усе я кажу “Вялікі Дзякуй”! Дзякуй усім, хто знайшоў час сення пасля працы пасярэдзіне тыдня і прыйшоў сюды. Дзякуй “старой дыяспаре”, нашым сябрам і сяброўкам за тое, што з’ядналіся летам 2020 і працягваем весці беларускую павестку у Нямеччыне. Дзякуй за шматлікія мерапрыемствы на Ноч Растраляных паэтаў,

Брэмен, Берлін і Дзюсельдорф. Дзякуй Мюнхен за фестываль беларускай культуры Мінск і Мінга, а таксама за неверагодны палатачны летнік дыяспары. Дзякуй шматлікім суполкам па усей Нямеччыне за інфармацыйныя евенты пра палітвязняў, пра культуру Беларусі, пра беларускую мову, пра нашу Беларусь. Дзякуй Разам Кунст за музычныя і мастацкія імпрэзы, якія паказваюць, што беларускае мастацтва – гэта частка Берлінскага, еўрапейскага і сусветнага мастацтва. Вялікі дзякуй праектнай камандзе за медыя-заўтракі з нямецкімі журналістамі і палітыкамі, якія даюць дадатковы штуршок пісаць пра Беларусь.

Вялікі дзякуй камандам праектнаў Краіна і ПерспАктів і нашым партнерам за арт-рэзідэнцыі і экпертныя паездкі для журналістаў і медыя супрацоўнікаў. Вялікі дзякуй тым, хто зрабіў праграму па рэзідэнцыям для праваабаронцаў магчымай. І канеше усім, хто па усіх федеральных землях працуе над тым, каб дэмакратычная Беларусь была бачнай па усей Нямеччыне, а злачынства Лукашэнскаўскага рэжыму нельга было б схаваць за маўчаннем грамадства ці прэссы. І канешне камандам па дапамозе палітычным уцекачам у Нямечынне, Разам Хелп, па падтрымцы шэлтэра для былых палітвязняў у Польшчы і па падтрымцы сямей палітвязняў, якія усе яшчэ за кратамі...

За апошнія тры гады дыяспара зрабіла вельмі шмат і мы заўседы ведалі, што гэта вельмі раздражняе рэжым у Менску. Асаблівыя спісы у КГБ, немагчымасць вярнуцца у Беларусь, пападанне нашых сацсетак у спіс экстрэміскіх медыя і г.д. Але ж гэты верасень паказаў наколькі Лукашенка жадае кантраляваць дыяспару і пашырыць магчымасці рэпрэсій супраць яе. Новы закон, які забараняе консульствам і амбасадам па сутнацсі выконваць іх абавязкі па працы з дакументамі і пашпартамі – гэта новы механізм

ціску і рэпрэсій менавіта супраць беларусаў і беларусак замежжа.

Разам адрэгавала на гэта тэрмінова. Ведаючы, што нямецкія ўлады на месцах ня вельмі добра інфармаваныя пра палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі, мы сталі звяртацца па гэтым пытанні да федэральных і зямельных уладаў і палітыкаў. Былі падрыхтаваны адпаведныя лісты з праблематыкай і наступствамі для беларусаў і беларусак Нямеччыны гэтага новага указа. І самае галоўнае былі зроблены прапановы, як нямецкі урад можа дапамагчы на аператыўным узроўні. Гэтыя лісты леглі на стол прэзідэнта Федэральнага Ведамства па пытаннях міграцыі і бежанцаў (BAMF), дэпутатаў з парламенцкай групы "Дэмакратычная Беларусь", а таксама ў адпаведны аддзел Міністэрства Унутраных Спраў. Урад Германіі таксама быў праінфармаваны аб складаных выпадках, з якімі зараз сутыкнуліся актывісты ў сувязі з немагчымасцю вяртання ў Беларусь.

Тэма пашпартоў асвятлялася ў брыфінгу па сітуацыі ў Беларусі з дэпутатамі ўрада Германіі ад сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі (СДПГ), а таксама ад хрысціянска-дэмакратычнага саюза Германіі (ХДС), якія праводзіліся сумесна за Ліберека.

Таксама Разам знаходзіцца ў пастаянным інфармацыйным абмене з офісам дэпутата бундэстага ад нямецкай партыі "Саюз-90/"зялёныя" Робіна Вагенера (Robin Wagener), які таксама з'яўляецца каардынатарам Міністэрства Замежных Спраў па пытаннях міжграмадскага супрацоўніцтва з Паўднёвым Каўказам, Рэспублікай Малдова і краінамі Цэнтральнай Азіі і ў рамках гэтай пазіцыі займаецца пытаннямі грамадзянскай супольнасці і дыяспары Беларусі ў Нямеччыне.

Пытанне пашпартоў стала часткай медыя-дыскусіі "Тры гады надзвычайнага становішча: беларуская грамадзянская супольнасць восенню 2023 года", на якую беларуская супольнасць Razam e.V. запрасіла ў канцы верасня былога пасла Германіі ў Мінску Манфрэда Хутэрэра.

Каманда RAZAM Help падрыхтавала шырокую інфармацыйную платформу аб магчымасцях легалізацыі ў Германіі ў выпадку немагчымасці падаўжэння або атрымання пашпарта ў Беларусі. Праўленне RAZAM распрацавала працэдуру падтрымкі актывістаў і палітычных бежанцаў афіцыйнымі лістамі, якія пацвярджаюць іх дзейнасць у падтрымку дэмакратычнай Беларусі і небяспека ці немагчымасць іх вяртання ў Беларусь. Нарэшце, быў аўтарызаваны пераклад дэкрэта на нямецкую мову, які будзе апублікаваны на нашым сайце.

Нашыя дзеянні і інфармацыйная кампанія сканцэнтраваныя на тым, каб наступствы гэтага закону для беларускай дыяспары былі зразумелыя нямецкаму грамадству і ўладам. Вядучы бесперапынны дыялог з нямецкімі палітыкамі і ўрадам, мы прыкладаем усе намаганні, каб Міністэрства Унутраных Спраў распрацавала інфармацыйны бюлетэнь па Беларусі і пытанні пашпартоў, якім будуць карыстацца мясцовыя аддзелы па пытаннях міграцыі для прыняцця рашэнняў па індывідуальных заяўках. Менавіта там, у лакальных аддзелах і будзе прымацца рашэнне па кожнаму беларусу і беларуске і ад менавіта ад падрыхтаванасці чыноўнікаў залежыць якасць такого рашэння. Беларусь павінна быць бачнай і там.

І за усе гэту працу я сення таксама кажу усім, хто у ей удзельнічаў, сябрам і сяброўкам Разам, нашым партнерам, нямецкім палітыкам і журналістам ДЗЯКУЙ!

Мы працягнем РАЗАМ захоўваць Беларусь тут у Нямеччыне, у сэрдцы Еўропы і усіх, хто яшчэ там у няволі, у нашых сэрдцах. РАЗАМ мы верым, можам і пераможам!

Жыве Беларусь!

**Rede der 1. Vorsitzenden von RAZAM e.V. Yuliya Salauyova vor dem Brandenburger Tor (07.11.2023)**

Liebe Belarusinnen und Belarusen,

Berlinerinnen und Berliner,

Deutsche Freunde und Freundinnen,

Liebe Sviatlana Tsikhanouskaya und ihr Team,

Liebe Kolleginnen und Kollegen der Botschaft des Volkes von Belarus und von Libereco,

Vielen Dank, dass Sie heute bei uns auf dem Platz vor dem Brandenburger Tor seid, bei einer Kundgebung für ein freies Belarus, ein Land, das von Berlin aus in weniger als 2 Stunden zu erreichen ist. So nah, aber so fern. Für viele Menschen aus Belarus, die schon lange in Berlin leben und die in den vergangenen Jahren zur Flucht gezwungen wurden, sind diese zwei Stunden der Unterschied zwischen einem freien Leben und der Polizeigewalt des

verbrecherischen Regimes von Lukaschenka. Nach diesen zwei Stunden kann jeder, der einst die demokratische Bewegung Belarus in Deutschland unterstützt hat, hinter Gittern landen und dort zwischen zwei Stunden und vielen Jahren verbringen...

Zwei Stunden Reisen zu unseren Eltern, zu unseren Freunden und Freundinnen, zu unseren Lieblingsorten, an denen wir geboren oder aufgewachsen sind, wo unsere Jugend oder Kindheit auf uns wartet, diese Stunden sind nun ein Leben lang, weil ein verrückter Diktator an der Macht festhält und das auf Kosten von Blut. Und deshalb werden Sie, liebe Berlinerinnen und Berliner, Belarus mit seinen vielen kulturellen Veranstaltungen und dem Stadtleben, das sich kaum vom Leben eines europäischen Orts unterscheidet, nach einer zweistündigen Fahrt leider nicht sehen können. Zur Zeit...

Leider ist Belarus heute ein Land der inneren Emigration, in dem man Angst vor der Unterdrückung durch das Regime hat, Angst vor dem Verlust des Arbeitsplatzes, Angst davor, in einem Gefängnistransporter zu landen... Mehr als 1.500 politische Gefangene, jede Woche Verhaftungen an der Grenze und im Land, Bilder von Folter und verbotenen Behandlungen bei Ermittlungen in politisch motivierten Strafverfahren sowie verbotenen Umgangsmethoden bei Häftlingen im Verwaltungsverfahren, ganz zu schweigen von politischen Gefangenen.

Aber wo kann man noch das kreative, lebendige, wenn auch sehr müde Belarus sehen, das trotz allem weiter am Belarus der Zukunft arbeitet, im Ausland im Exil? Mehr als eine halbe Million belarussische Männer und Frauen wurden seit Sommer 2020 zur Emigration gezwungen, darunter viele Nichtregierungsorganisationen, Unternehmer, Journalisten, Kulturschaffende, die akademische Elite, Studierende, Ärzte, Politiker, Menschenrechtsverteidiger und Gewerkschafter und Mitglieder von Streikkomitees, ich kann sie nicht alle aufzählen... Tausende kamen einst nach Deutschland, von denen etwa 400 ein spezielles politisches Asylprogramm erhalten.

Und heute sage ich als Vorsitzende Belarussischen Gemeinschaft RAZAM e.V. zunächst einmal „Vielen Dank“! Vielen Dank an alle, die sich heute mitten in der Woche die Zeit genommen haben, hierher zu kommen. Vielen Dank an die „alte Diaspora“, unsere Freunde, die sich uns im Sommer 2020 angeschlossen haben und weiterhin die belarusische Agenda in Deutschland vorantreiben. Vielen Dank für die vielen Veranstaltungen zur Nacht der erschossenen Dichter, Bremen, Berlin und Düsseldorf. Vielen Dank an München für das Festival der belarussischen Kultur “Minsk x Minga” sowie für das unglaubliche Diaspora-Sommercamp. Vielen Dank an die vielen Gemeinden in ganz Deutschland für Informationsveranstaltungen über politische Gefangene, über die Kultur von Belarus, über die belarusische Sprache, über unser Belarus. Vielen Dank an Razam Kunst für musikalische und künstlerische Veranstaltungen, die zeigen, dass belarusische Kunst ein Teil der Berliner, der europäischen und der weltweiten Kunstszene ist. Vielen Dank an das Projektteam für die Medienfrühstücke mit deutschen Journalisten und Politikern, die dem Schreiben über Belarus zusätzliche Impulse verleihen.

Vielen Dank an die Projektteams von Kraina und PerspAktiv und unsere Partner für Kunstresidenzen und Expertenreisen für Journalisten und Medienmitarbeiter. Vielen Dank an diejenigen, die das Residenzprogramm für Menschenrechtsverteidiger ermöglicht haben. Und an alle, die sich in allen Bundesländern dafür einsetzen, dass das demokratische Belarus in ganz Deutschland sichtbar ist und die Verbrechen des Lukaschenka-Regimes nicht hinter dem Schweigen der Gesellschaft oder der Presse verborgen bleiben dürfen. Und natürlich an die Teams zur Unterstützung politischer Flüchtlinge in Deutschland, Razam Help, zur Unterstützung der Unterkunft für ehemalige politische Gefangene in Polen und zur Unterstützung der Familien politischer Gefangenen, die immer noch hinter Gittern sitzen ...

In den letzten drei Jahren hat die Diaspora viel getan, und wir wussten immer, dass dies für das Regime in Minsk ein Dorn im Auge

ist. Die namentliche Erwähnung von Personen in den Listen des KGB, die Unmöglichkeit der Rückkehr nach Belarus, die Aufnahme unserer sozialen Netzwerke in die Liste extremistischer Medien usw. Doch dieser September zeigte, wie sehr Lukaschenka die Diaspora kontrollieren und die Repressionsmöglichkeiten gegen sie erweitern will. Das neue Dekret, das Konsulaten und Botschaften grundsätzlich die Erfüllung ihrer Pflichten in Bezug auf Dokumente und Pässe verbietet, ist ein neuer Druck- und Repressionsmechanismus speziell gegen Belarusen im Ausland.

RAZAM hat umgehend darauf reagiert. Da wir wussten, dass die deutschen Behörden vor Ort nicht sehr gut über die politischen Repressionen in Belarus informiert sind, haben wir begonnen, dieses Thema bei den Bundes- und Regionalbehörden sowie bei Politikern anzusprechen. Es wurden entsprechende Briefe mit den Problemen und Konsequenzen dieser neuen Verordnung für die Belarussen in Deutschland vorbereitet. Und vor allem wurden Vorschläge gemacht, wie die Bundesregierung auf operativer Ebene helfen kann. Diese Briefe landeten auf dem Schreibtisch des Präsidenten des Bundesamtes für Migration und Flüchtlinge (BAMF), von Abgeordneten der Fraktion „Demokratisches Weißrussland“ sowie der zuständigen Abteilung des Innenministeriums. Die Bundesregierung wurde auch über die schwierigen Fälle informiert, mit denen die Aktivisten derzeit konfrontiert sind, da eine Rückkehr nach Belarus nicht möglich ist.

Das Thema Reisepässe wurde in einem Briefing zur Lage in Belarus mit Abgeordneten der Sozialdemokratischen Partei Deutschlands (SPD) sowie der Christlich Demokratischen Union Deutschlands (CDU) behandelt, das gemeinsam abgehalten wurde mit Libereco.

Razam steht auch in ständigem Informationsaustausch mit dem Büro des Bundestagsabgeordneten der Partei “Bündnis 90/Die Grünen“ Robin Wagener, der auch Koordinator des Auswärtigen Amts für Fragen ist zur intergesellschaftlichen Zusammenarbeit mit dem

Südkaukasus, der Republik Moldau und anderen Ländern Zentralasiens. Er beschäftigt sich im Rahmen dieses Amts mit Fragen der Zivilgesellschaft und der belarussischen Diaspora in Deutschland.

Das Thema Reisepässe wurde Teil des Mediengesprächs „Drei Jahre Ausnahmezustand: Die belarussische Zivilgesellschaft im Herbst 2023“, zu dem die Belarusische Gemeinschaft Razam e.V. Ende September den ehemaligen deutschen Botschafter in Minsk, Manfred Huterer eingeladen hat.

Das Team von RAZAM Help hat eine umfassende Informationsplattform zu den Möglichkeiten der Legalisierung in Deutschland für den Fall vorbereitet, dass die Erneuerung oder Erlangung eines Reisepasses in Belarus nicht möglich ist. Der RAZAM-Vorstand hat ein Verfahren zur Unterstützung von Aktivisten und politischen Flüchtlingen entwickelt. Mit einem offiziellen Schreiben wird bescheinigt, dass die Betroffenen an Aktivitäten zur Unterstützung eines demokratischen Belarus beteiligt gewesen sind und ihnen Gefahr bei einer Rückkehr nach Belarus droht. Schließlich wurde eine offizielle deutsche Übersetzung des Dekrets autorisiert, das auf unserer Website veröffentlicht wird.

Unser Aktions- und Informationskampagnenziel ist es, der deutschen Öffentlichkeit und den Behörden die Folgen dieses Dekrets für die belarusische Diaspora deutlich zu machen. Im kontinuierlichen Dialog mit der deutschen Politik und der Regierung setzen wir uns dafür ein, dass das Innenministerium ein Informationsbulletin zu Belarus und Passfragen entwickelt, das den lokalen Migrationsbehörden zur Entscheidung über einzelne Anträge dienen wird. Dort, in den örtlichen Dienststellen, wird die Entscheidung für jeden Belarusen getroffen, und die Entscheidung hängt von der entsprechenden

Vorbereitung der Beamten ab. Aus diesem Grund muss Belarus sichtbar gemacht werden.

Und für all diese Arbeit sage ich heute auch DANKE an alle, die daran teilgenommen haben, Freunde und Freundinnen von Razam, unsere Partner, deutsche Politiker und Journalisten!

Gemeinsam werden wir Belarus hier in Deutschland, im Herzen Europas, und alle, die dort noch in Gefangenschaft sind, in unseren Herzen behalten. Gemeinsam glauben wir, dass wir gewinnen können und werden!

Es lebe Belarus!